УДК 338.43.02(476)(091)«1965/1985»

***М.У. Смяховіч***
*канд. гіст. навук, дац., заг. Цэнтра новай і навейшай гісторыі Беларусі*
*Інстытута гісторыі НАН Беларусі*
e-mail: smenic18@mail.ru

# САВЕЦКАЯ АГРАРНАЯ ПАЛІТЫКА Ў БЕЛАРУСІ: КІРУНКІ, ПРАБЛЕМЫ, ВОПЫТ (1965–1985 гг.)

*Праведзены аналіз асноўных кірункаў і мэт аграрнай палітыкі СССР у Беларусі на працягу 1965–1985 гг. Вызначаны як станоўчыя, так і негатыўныя вынікі ў развіцці сельскай гаспадаркі, акрэслены праблемы, якія стрымлівалі развіццё аграрнага сегмента эканомікі; ахарактарызаваны вынікі дзейнасці партыйна-дзяржаўнага кіраўніцтва Савецкага Саюза ў вырашэнні аграрнага пытання. Зроблена выснова аб тым, што сакавіцкі 1965 г. мадэрнізацыйны праект, рэалізацыя асноўных палажэнняў гаспадарчай рэформы 1965 г. стымулявалі далейшае развіццё сельскай гаспадаркі Беларусі. Ужо на пачатку 1970-х гг. аграрная галіна БССР у межах эканамічнага комплексу Савецкага Саюза заняла лідарскія пазіцыі па вытворчасці збожжа. Але ў 1971–1981 гг. дасягненні аграрнай галіны не былі падмацаваны ідэяй яе прыярытэту ва ўмацаванні сацыяльнай стабільнасці дзяржавы. Агульнасаюзная харчовая праграма 1982 г. нават у перспектыве не дазваляла ліквідаваць тэхналагічнае адставанне сельскагаспадарчай галіны ад краін-канкурэнтаў. У выніку Савецкая дзяржава і яе кіраўніцтва не здолелі вырашыць сялянска-аграрнае пытанне па задавальненні спажывецкага попыту на харчовую прадукцыю.*

## Уводзіны

Дабрабыт народа і харчовая бяспека Рэспублікі Беларусь самым непасрэдным чынам залежаць ад стану развіцця сельскай гаспадаркі. Аграрнае, у прыватнасці харчовае, пытанне аказвае моцны ўплыў на сацыяльны клімат любой дзяржавы. Правячыя эліты заўсёды надавалі вялікую ўвагу станоўчаму вырашэнню гэтага пытання.

Па нашым вызначэнні, *аграрная палітыка КПСС – КПБ – гэта сукупнасць праграмных канцэпцый і мэт, формаў і сродкаў практычных дзеянняў Савецкай дзяржавы па іх ажыццяўленні, якія былі накіраваны на вырашэнне аграрнага пытання, задавальненне спажывецкага попыту на харчовыя тавары, забеспячэнне інтарэсаў і патрэб сялянства* (тут і далей курсіў наш. – *М.С.*). Безумоўна, асноўная роля ў вырашэнні аграрнага пытання належала палітычным інстытутам Савецкай дзяржавы. Па той прычыне, што ў цэлым развіццё сельскай гаспадаркі і вырашэнне харчовай праблемы напрамую залежалі ад палітыкі вышэйшай партыйна-дзяржаўнай эліты, а таксама ад практычнай дзейнасці адміністрацыйна-гаспадарчага кіраўніцтва калгасаў і саўгасаў. Так, пэўныя поспехі і здабыткі ў развіцці беларускай сельскай гаспадаркі былі, а практычныя намаганні дзяржавы па рэалізацыі аграрнай палітыкі дазволілі набыць багаты вопыт у вырашэнні аграрнага пытання. Аналіз савецкай аграрнай палітыкі дазволіць вызначыць як станоўчыя, так і негатыўныя вынікі практычнай дзейнасці савецкай эліты, акрэсліць праблемы, якія не страцілі актуальнасці і ва ўмовах незалежнай Беларусі. Напрыклад, як і ў савецкія часы, тормазам на шляху інтэнсіфікацыі аграрнай вытворчасці з’яўляецца невырашанасць праблемы неэфектыўных гаспадарак, у якіх і сёння пераважае вытворчасць, заснаваная на экстэнсіўных метадах гаспадарання.

Вывучэнню розных старонак гісторыі савецкай аграрнай палітыкі ў Беларусі прысвяцілі свае працы (дысертацыі, манаграфіі) А. Арбузаў, А. Балыкоў, Г. Дубінчык, М. Злобін, М. Касцюк, М. Кузняцоў, П. Корнеў, Ю. Смірноў, Р. Платонаў і інш. Гэтае пытанне разглядалася і ў шматтомных выданнях па гісторыі Беларусі. Неабходна адзначыць, што спробы асэнсаваць назапашаны вопыт рабіліся савецкімі навукоўцамі. Але некрытычны падыход да працы з крыніцамі і літаратурай, апалагетыка аграрнай палітыкі савецкай правячай эліты не дазвалялі навукоўцам скласці аб’ектыўную карціну, уласцівую працэсу развіцця аграрнага комплексу Беларусі.

Асноўнай задачай артыкула з’яўляецца вызначэнне мэт, кірункаў і асаблівасцяў савецкай аграрнай палітыкі ў Беларусі ў 1965–1985 гг.

**Другая спроба мадэрнізацыі сельскай гаспадаркі**

Першая спроба мадэрнізацыі сельскай гаспадаркі СССР і БССР была зроблена ў перыяд з верасня 1953 г. па 1961 г. Аднак пасля прыняцця трэцяй праграмы КПСС, у якой былі акрэслены новыя задачы развіцця сельскай гаспадаркі, неабходна было забяспечыць іх вырашэнне. З гэтай мэтай у сакавіку 1965 г. быў скліканы пленум ЦК КПСС, на якім з дакладам «Аб неадкладных мерах па далейшым развіцці сельскай гаспадаркі СССР» выступіў Л. Брэжнеў. У прынятай пастанове была раскрытыкавана ўся сельскагаспадарчая палітыка папярэдняга кіраўніцтва як у планаванні, так і ў арганізацыі сістэмы кіравання сельскай гаспадаркай. Адзначалася, што асноўнымі прычынамі адставання сельскай гаспадаркі былі «парушэнні эканамічных законаў развіцця сацыялістычнай вытворчасці, …суб’ектывізм у кіраўніцтве, што прыводзіла да памылак у планаванні, фінансаванні і крэдытаванні сельскай гаспадаркі, у палітыцы цэн» [1, с. 503].

Варта звярнуць увагу на тое, што ні ў дакладзе Л. Брэжнева, ні ў пастанове пленума тэрміны «рэформа», «рэфармаванне» не выкарыстоўваліся. Размова ішла аб развіцці. Аднак спроба рашуча адмовіцца ад бюракратычна-загадных метадаў кіраўніцтва сельскагаспадарчай галіной, распрацаваць і ажыццявіць сістэму эканамічных мерапрыемстваў, якія б далі магчымасць, як было заяўлена, *«падвесці пад сельскую гаспадарку трывалую эканамічную аснову»* [2, с. 31], закранала менавіта форму і змест аграрнай палітыкі. Іменна дзеля гэтага ў сакавіку 1965 г. *ствараліся ўмовы пераходу на новую сістэму гаспадарання, на ўзмацненне эканамічных метадаў кіраўніцтва гаспадаркай.* Таму ёсць некаторыя падставы весці гаворку аб спробе рэфармавання сельскагаспадарчай галіны СССР, у тым ліку і БССР.

Для таго каб выправіць дапушчанныя пралікі, было вырашана знізіць планавыя паказчыкі, наблізіць іх да вынікаў вытворчай дзейнасці гаспадарак, устанавіць на кожны год восьмай пяцігодкі і не мяняць надалей. Для савецкай планава-дырэктыўнай сістэмы гэта быў параўнальна новы падыход, таму што ўпершыню за ўсю савецкую гісторыю было прынята рашэнне наблізіць вытворчыя планы-дырэктывы да жыццёвай рэчаіснасці. Абмеркаванне праблем развіцця калгасна-саўгаснай вытворчасці завяршылася распрацоўкай і прыняццем цэлага шэрагу практычных мерапрыемстваў. Першымі з іх былі пастановы Савета Міністраў СССР аб павышэнні матэрыяльнай зацікаўленнасці калгасаў і саўгасаў у павялічэнні вытворчасці і продажы дзяржаве малака, мяса, пшаніцы, жыта, грачыхі, проса, насення сланечніка, цукровых буракоў, іншых культур. Усяго было прынята 16 урадавых пастаноў такога тыпу.

У лютым 1966 г. быў скліканы XXIII з’езд КПСС, на якім лінія Сакавіцкага пленума была замацавана. З’езд канстатаваў, што за апошнія гады некалькі замарудзіліся тэмпы росту вытворчасці і прадукцыйнасці працы, знізілася эфектыўнасць выкарыстання вытворчых фондаў. У сувязі з гэтым на VIII пяцігодку ставілася задача забяспечыць больш высокія тэмпы росту экономікі краіны. Ніякіх канкрэтных паказчыкаў па вытворчасці малака і мяса дырэктывы гэтага з’езда не ўтрымлівалі. Разам з тым брэжнеўскія дырэктывы, адрасаваныя кіраўніцтву ЦК КПБ, прадугледжвалі павялічэнне вытворчасці мяса ў рэспубліцы у 1,3 раза і цэльнамалочнай прадукцыі – у 1,6–1,7 раза ў параўнанні з паказчыкамі 1965 г. [3, с. 73, 74]. У мэтах матывацыі сялянства да выканання заданняў VIII пяцігодкі 16 мая 1966 г. была прынята сумесная партыйна-ўрадавая пастанова «Аб павышэнні матэрыяльнай зацікаўленасці калгаснікаў у развіцці грамадскай вытворчасці» [4, с. 103–104], якая рэкамендавала калгасам увесці з 1 ліпеня 1966 г. гарантаваную аплату працы калгаснікаў.

Прынятыя меры спрыялі таму, што VIII пяцігодка была адной з самых выніковых для ўсіх саюзных рэспублік. Паказчыкі і эканамічныя дасягненні СССР у гады VIII

пяцігодкі таксама былі найлепшымі за ўсю савецкую гісторыю: сярэднегадавыя тэмпы прыросту прадукцыйнасці працы ў сельскай гаспадарцы СССР склалі 6,2%, у той час як у 1961–1965 гг. – толькі 3,4% [5, с. 235, 238]. У 1970 г. у СССР было сабрана 186 млн т збожжа і 6,9 млн т бавоўны. «Такіх высокіх валавых збораў мы яшчэ ніколі не мелі», – заявіў Л. Брэжнеў [6, с. 32, 34]. У БССР вынікі выканання заданняў VIII пяцігодкі былі падведзены на XXVII з'ездзе КПБ. Упершыню за ўсю пасляваенную гісторыю поспехі рэспублікі ў сельскай гаспадарцы былі названы П. Машэравым «адчувальнымі зрухамі» [7, с. 15]. У эканамічных паказчыках гэтыя зрухі былі наступнымі: у калгасах і саўгасах БССР вытворчасць валавай сельскагаспадарчай прадукцыі за VIII пяцігодку ў параўнанні з папярэднім перыядам павялічылася на 45%, зборы збожжа павялічыліся на 53%, бульбы – на 43%, вытворчасць мяса – на 73%, малака – на 66% і яек – у 2,4 раза; усе калгасы і саўгасы былі электрыфікаваны [7, с. 15, 16].

І ўсё ж, хаця вынікі VIII пяцігодкі і абнадзейвалі кіраўнікоў ЦК КПСС, яны не адпавядалі паказчыкам, якія былі задэкларававаны ў трэцяй праграме КПСС. Таму ў 1971 г. у якасці галоўнай мэты IX пяцігодкі XXIV з'езд КПСС паставіў задачу павышэння эфектыўнасці прамысловай вытворчасці і паскарэння росту прадукцыйнасці працы ў гэтым сегменце эканомікі. Што да сельскай гаспадаркі, то на з'ездзе было прызнана: гэтая галіна была і пакуль застаецца «найбольш складаным і цяжкім участкам нашай эканомікі» [8, с. 37]. Пры такой канстатацыі кіраўніцтву ЦК КПСС патрэбна было зрабіць гэтую галіну эканомікі адным з найважнейшых, першачарговых прыярытэтаў, такім жа, якім была, да прыкладу, палітыка ў галіне ваеннай бяспекі СССР. Нагадаем, што ў 1969 г. на Далёкім Усходзе абвастрылася канфрантацыя з Кітаем, якая перарасла ў кітайска-савецкі ўзброенны канфлікт. У выніку ў гады IX пяцігодкі Савецкі Саюз у тэрміновым прыярытэтным парадку быў вымушаны затраціць на стварэнне ваеннай інфраструктуры на кітайска-савецкім памежжы 200 млрд руб. [9, с. 159], прычым у значнай меры за кошт сельскай гаспадаркі.

Аднак у адрозненне ад пытанняў ваеннай бяспекі, сельская гаспадарка не атрымала прыярытэтнага статусу. На XXIV з'ездзе брэжнеўскае кіраўніцтва абмежавалася канстатацыяй, што за адзін, два і нават за пяць гадоў праблемы сельскай гаспадаркі ў поўным аб'ёме не вырашыць; для гэтага будзе патрэбны больш значны тэрмін, вялізныя асігнаванні, вялікія намаганні не толькі працаўнікоў сельскай гаспадаркі, але і ўсёй прамысловасці [8, с. 52]. На наш погляд, такі няспешны, інертна-павольны падыход брэжнеўскага кіраўніцтва да сельскай гаспадаркі сведчыў аб стратэгічным пралiку ў арганізацыі планавання, вызначэнні найбольш складаных эканамічных праблем краіны і шляхоў іх вырашэння. Як засведчылі IX–XI пяцігодкі, палітыка адкладвання на чарговую пяцігодку вырашэння наспелых задач па забеспячэнні насельніцтва сельскагаспадарчай прадукцыяй была неабгрунтаванай і недальнабачнай.

Гэта праявілася і ў тым, што на IX пяцігодку былі вызначаны прамежкавыя задачы. У тактычным плане ставілася задача зрабіць вялікі крок ва ўмацаванні матэрыяльна-тэхнічнай базы сельскай гаспадаркі, што павінна было дапамагчы «ў будучым поўнасцю вырашыць праблемы сельскагаспадарчай вытворчасці і пераўтварэння сяла» [8, с. 52]. Беларускае кіраўніцтва на хвалі дасягнутых поспехаў падышло да вызначэння новых задач больш канкрэтна. На XXVII з'ездзе КПБ было вырашана: да канца IX пяцігодкі прадукцыйнасць працы ў сельскай гаспадарцы рэспублікі павялічыцца на 50%, за кошт гэтага валавы збор збожжа складзе не менш за 7 млн т, ураджайнасць збожжавых у сярэднегадавым вылічэнні павысіцца да 27–28 ц/га, бульбы – да 160–170 ц/га, ільновалакна – да 6–8 ц/га, на 100 га сельгасугоддзяў будзе атрымана не менш за 100 ц мяса і 500 ц малака [10, с. 325, 326, 328].

Задачы, якія былі вызначаны на IX пяцігодку, у далейшым абмяркоўваліся на пленумах ЦК КПСС. У 1971–1975 гг. было праведзена 6 пленумаў па пытаннях развіцця сельскай гаспадаркі. Практычна на кожным з іх ішла размова аб тым, што мясцовае

партыйна-дзяржаўнае кіраўніцтва слаба накіроўвае работу калгасаў і саўгасаў, мірыцца з фактамі безгаспадарлівасці, недысцыплінаванасці ў выкананні планаў. Але дырэктывы і пастановы брэжнеўскіх з'ездаў і пленумаў справе не дапамагалі. Наадварот, яны сведчылі, што ў палітыцы савецкага кіраўніцтва нарастала дэкларатыўнасць і паглыблялася безадказнасць за вынікі калгасна-саўгаснай вытворчасці. Пры Л. Брэжневе гэтыя з'явы сталі будзённасцю гаспадарчага жыцця. Надалей яны перараслі ў рапартаманію і шуміху, якімі жылі партыйныя камітэты ўсіх ўзроўняў.

Выкананне заданняў IX пяцігодкі было агучана на XXVIII з'ездзе КПБ, які адбыўся ў лютым 1976 г. П. Машэраў адзначыў, што ў калгасах і саўгасах БССР вытворчасць валавай прадукцыі сельскай гаспадаркі ў параўнанні з VIII пяцігодкай вырасла на 22%, збожжа – на 57%, мяса – на 45%, малака – на 25%, яек – у 2,6 раза. Асаблівы акцэнт быў зроблены на поспехі ў вытворчасці збожжа. Сярэднегадавая ўраджайнасць збожжавых і зернебабовых склала 23,3 ц/га. «Гэта значны рост, радасны і павучальны вынік нашай работы», – сказаў П. Машэраў [11, с. 10]. Яму, аднак, давялося прызнаць, што многія планавыя паказчыкі не былі выкананы: «Заданні пяцігадовага плана па вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі, як вядома, выкананы ў рэспубліцы не па ўсіх пазіцыях. Нас не можа не хваляваць пагаршэнне некаторых важных паказчыкаў, якія вызначаюць эканамічны ўзровень гаспадарання, рост сабекошту раду відаў прадукцыі, зніжэнне ў вялікай групе калгасаў і саўгасаў рэнтабельнасці вытворчасці» [11, с. 14].

**Нарастанне цяжкасцей у вытворчасці харчавання. Праблема інтэнсіфікацыі сельскагаспадарчай вытворчасці**

Цікава, што невыкананне сельскай гаспадаркай планавых паказчыкаў падштурхоўвала М. Хрушчова да пошуку і актыўных дзеянняў, ён імкнуўся пазбягаць застою ў працы партыйнага апарату. Дзейнасць Л. Брэжнева была супрацьлеглай. Невыкананне сельскай гаспадаркай планавых паказчыкаў яго не турбавала. Акрамя абмеркавання на пленумах і прыняцця пастаноў, ніякіх іншых ініцыятыў ён не праяўляў і структурных рэарганізацый не праводзіў. У выніку ў практычнай дзейнасці партыйнай наменклатуры і структур дзяржаўнага кіравання ўзмацняўся застой, калі справа падмянялася параднасцю і рапартаманіяй. На нашу думку, у параўнанні з хрушчоўскім суб'ектывізмам адзначаныя з'явы нанеслі савецкай сістэме, яе эканоміцы не тое што большы, а несувымяральна большы ўрон і такую ж шкоду. Выпраўляць становішча трэба было ўжо ў 1971 г., калі быў скліканы XXIV з'езд КПСС. Але брэжнеўскае кіраўніцтва не змяніла падыходаў да вырашэння аграрнага пытання ні ў 1971 г., ні ў 1976 г. У справаздачным дакладзе на XXV з'ездзе КПСС, гаворачы аб сельскай гаспадарцы, Л. Брэжнеў заявіў: «Мы рэалісты. Мы добра ведаем, што якаснае пераўтварэнне сельскагаспадарчай вытворчасці патрабуе часу, працы, вялізных укладанняў. Тым больш, што па шэрагу прычын, у асноўным аб'ектыўна-гістарычнага характару, толькі ў апошні час мы пачалі выдзяляць для гэтай галіны вялікія сродкі» [12, с. 73].

Менавіта такі ход падзей імкнуўся прадухіліць М. Хрушчоў, калі ў 1962–1964 гг. ён паспрабаваў прымусіць партыйна-дзяржаўнае кіраўніцтва больш канкрэтна і прадметна займацца жывёлагадоўляй, вытворчасцю мяса і малака калгасамі і саўгасамі, каб на працягу 10 гадоў вырышыць гэтую праблему, як ён гаварыў, раз і назаўжды. Тады прыхільнікі Л. Брэжнева да хрушчоўскіх парад не прыслухаліся, яны адправілі ініцыятара рэарганізацый партыйнага апарату на пенсію. Аднак у далейшым, як засведчыў гістарычны вопыт, аграрная палітыка брэжнеўскіх «рэалістаў» не адпавядала тэндэнцыям і запатрабаванням сацыяльнага развіцця савецкага грамадства: у партыі не было ні часу, ні здольнасці да вырашэння аграрных праблем. Але, самае галоўнае, былі абмежаваны фінінсавыя магчымасці дзяржавы. У 1979 г. СССР быў уцягнуты ў ваенную кампанію ў Афганістане, якая аказвала негатыўны ўплыў на дзяржаўны бюджэт СССР, асабліва ў галіне фінансавання сельскагаспадарчай вытворчасці.

У 1976 г., улічваючы дэкларацыю XXIV з’езда КПСС, што пытанні развіцця сельскай гаспадаркі застаюцца цяжкім участкам арганізацыйна-гаспадарчай працы дзяржавы, XXV з’езд КПСС захаваў пераемнасць гэтага палітычнага курса. У якасці галоўнай задачы на Х пяцігодку з’езд вызначыў неабходнасць паскорыць укараненне інтэнсіўных метадаў у жывёлагадоўлі, павысіць прадукцыйнасць і павялічыць пагалоўе жывёлы і птушкі. Разам з тым у цэнтр увагі Х пяцігодкі, «пяцігодкі эфектыўнасці і якасці», ставілася задача павышэння эфектыўнасці сельскай гаспадаркі, якаснага паляпшэння ўсіх паказчыкаў у гэтай галіне эканомікі [12, с. 68–73]. У сувязі з тым, што краіна адчувала востры недахоп збожжавых, на XXV з’ездзе было заяўлена: «Найбольш актуальная задача – рост вытворчасці збожжа. Гэта – ударны ўчастак работы» [12, с. 75]. Разам з тым на гэтым з’ездзе было прызнана, што «патрабуецца палепшыць арганізацыю і кіраванне сельскагаспадарчай вытворчасцю» [12, с. 77].

Трэба адзначыць, што і раней на XXIV з’ездзе КПСС ішла размова пра неабходнасць паляпшэння ў кіраванні сельскагаспадарчай вытворчасцю. Але рэальна нічога не паляпшалася, таму што з’езды КПСС не давалі прынцыповай ацэнкі дзейнасці кіраўніцтва ЦК КПСС у галіне сельскагаспадарчай палітыкі. Не было гэтага зроблена і на XXV з’ездзе, які прыняў дырэктывы на Х пяцігодку. У іх, акрамя чарговай актуалізацыі, так бы мовіць, традыцыйна нявырашанных пытанняў развіцця сельскай гаспадаркі, ішла гаворка і аб планамерным пераводзе апошняй на індустрыяльную аснову, разглядаліся праблемы фондааддачы, павышэння прадукцыйнасці працы, якасці прадукцыі, удасканалення арганізацыі і аплаты працы. Былі прыняты і новыя планавыя паказчыкі. Што да заданняў машэраўскаму кіраўніцтву на Х пяцігодку, то яны былі наступныя: забяспечыць рост сярэднегадавога аб’ёму валавай прадукцыі сельскай гаспадаркі на 11–14%, давесці вытворчасць зерня да 6,9–7,2 млн т, мяса (у забойнай вазе) – да 900 тыс т, павысіць ураджайнасць збожжавых да канца пяцігодкі да 32–34 ц/га, бульбы – да 180–200 ц/га, ільновалакна – да 6,5–7 ц/га, цукровых буракоў – да 280–300 ц/га, падняць надой малака ад каровы да 2 800–2 900 кг у год [11, с. 141].

У 1981 г. вынікі выканання заданняў Х пяцігодкі былі падведзены на XXVI з’ездзе КПСС. Яны былі правальнымі. Таму ў справаздачным дакладзе аналізу паказчыкаў развіцця сельскай гаспадаркі ў гады Х пяцігодкі Л. Брэжнеў прысвяціў 23 радкі з агульнага аб’ёму даклада ў 80 старонак тэксту. Было канстатавана, што ўзмацнілася тэхнічная база сельскагаспадарчай вытворчасці, узмацнілася комплексная механізацыя і індустрыялізацыя земляробства і жывёлагадоўлі. Было зноў заяўлена, што з пяці апошніх гадоў тры былі неспрыяльнымі, але, нягледзячы на гэта, «праца, накіраваная на ўздым сельскай гаспадаркі, прыносіць адчувальныя вынікі» [13, с. 34–35].

Вынікі аграрнай палітыкі брэжнеўскага партыйна-дзяржаўнага кіраўніцтва сапраўды былі «адчувальнымі», у тым сэнсе, што з паліц магазінаў усё часцей пачала знікаць прадукцыя жывёлагадоўлі, асабліва мясныя вырабы. На гэты конт было дэкларавана: «Цяжкасці з забеспячэннем насельніцтва харчаваннем усё яшчэ маюць месца», таму ў «мэтах радыкальнага вырашэння праблемы прызнана неабходным распрацаваць спецыяльную *харчовую праграму, …*яе мэта – вырашыць задачу бесперабойнага забеспячэння насельніцтва прадуктамі. Праца над гэтай праграмай толькі распачалася» [13, с. 45]. Сапраўды, адзначаныя цяжкасці хутка нарасталі, асабліва ў буйных прамысловых цэнтрах РСФСР. У пошуках выйсця кіраўніцтва ЦК КПСС узмацніла ціск на беларускую партыйна-дзяржаўную эліту. 26 кастрычніка 1981 г. бюро ЦК КПБ прыняло пастанову «Аб выкананні ўказанняў таварыша Л.І. Брэжнева аб пастаўках ва ўсесаюзны фонд мяса і малакапрадуктаў». У дадзеным выпадку «ўсесаюзным фондам» былі Масква і Ленінград, куды па строгім графіку ў «памесячным, дэкадным і штодзённым неадкладным рэжыме» [14, арк. 16] БССР адгружала мясную і малочную прадукцыю.

Аб маштабах паставак харчовай прадукцыі сведчаць такія факты. У надзвычай складаным 1976 г. дзяржаўныя рэсурсы мяса ў БССР пры запланаваных 594 400 тыс. т

фактычна склалі 552 688 тыс. т. У гэтым годзе з БССР ва ўсесаюзны фонд было адгружана 246 265 тыс. т мясных прадуктаў, альбо 44,2% ад ўсёй рэсурснай базы. Непасрэдна ў Маскву і Ленінград было пастаўлена 136 072 тыс. т мяса і каўбас, каля 20 тыс. т у іншыя гарады Расіі, што склала 63,3% ад агульнай колькасці мясапрадукцыі, пастаўленай у агульнасаюзны фонд [15, арк. 2–5]. Каэфіцыэнт паставак мясных і каўбасных вырабаў у РСФСР у 1976 г. склаў 1,23 да гадавого планавага задання, г.зн. план быў значна перавыкананы [14, арк. 5]. Акрамя таго, у 1976 г. з БССР экспартныя пастаўкі мясной прадукцыі ажыццяўляліся ў Бельгію (144 т), Швецыю (161 т), Фінляндыю (1 008 т), Чэхаславакію (287 т), Румынію (97 т), Францыю і іншыя краіны. Усяго ў гэтым годзе ў краіны далёкага замежжа было пастаўлена 2 699 т мясной прадукцыі найлепшай якасці [15, арк. 6, 7]. У такіх жа маштабах ажыццяўляліся пастаўкі малочнай прадукцыі. У 1979–1984 гг. БССР вялікія аб'ёмы сельскагаспадарчай прадукцыі пастаўляла на польскі спажывецкі рынак.

Калі закрануць пытанне вынікаў Х пяцігодкі ў БССР, то яны былі падведзены напрыканцы студзеня 1981 г. на XXIX з'ездзе КПБ. У чарговы раз партыйна-дзяржаўнае кіраўніцтва БССР было вымушана прызнаць, што калі ў IX пяцігодцы ў рэспубліцы прырост нацыянальнага даходу на 1 руб. капітальных укладанняў складаў 38 кап., то ў Х пяцігодцы гэты паказчык склаў толькі 25 кап. (25% да затрачанага) [16, с. 17, 24]. У справаздачным дакладзе было адзначана, што за Х пяцігодку на развіццё сельскай гаспадаркі было накіравана сродкаў у 1,3 раза больш, чым за папярэднюю, але сярэднегадавое павялічэнне аб'ёму вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі ў грамадскім сектары склала 15%, вытворчасць збожжа павысілася на 12%, мяса – на 21%, малака – на 18%, яек – у 1,6 раза. Адначасова было канстатавана, што калгасы і саўгасы БССР вырабілі менш прадукцыі, чым было запланавана [16, с. 11, 12]. Калі зайшла размова аб новых планавых дырэктывах, П. Машэраў заявіў: «Мы павінны давесці сярэднегадавы збор збожжа да 7,8–8,1 млн т. Для гэтага неабходна забяспечыць сярэднегадавую ўраджайнасць збожжавых не менш 26 цэнтнераў з гектара» [16, с. 14]. Акрамя таго было запланавана павялічыць сярэднегадавы аб'ём вытворчасці валавай прадукцыі сельскай гаспадаркі на 10–12%, атрымаць у грамадскім сектары вытворчасці ў разліку на 100 га сельгасугоддзяў па 142 ц мяса і 528 ц малака, павысіць прадукцыйнасць працы ў сельскай гаспадарцы на 25% [16, с. 101, 102, 104].

Неабходна акцэнтаваць ўвагу і на іншым. На XXVI з'ездзе КПСС у якасці цэнтральнай праблемы практычнай палітыкі была акрэслена задача «пераводу эканомікі на інтэнсіўны шлях развіцця» [13, с. 38]. Трэба дадаць, што гаворка аб інтэнсіфікацыі грамадскай вытворчасці на розных нарадах, пленумах і з'ездах вялася і да гэтага. Размоў было шмат, але справа рухалася дрэнна. На гэты конт яшчэ ў 1964 г. вельмі выразна выказаўся М. Хрушчоў: «У нас яшчэ моцная застарэлая хвароба – агульныя размовы, агульныя заклікі замест канкрэтнай арганізатарскай работы. Некаторыя нашы таварышы пераацэньваюць сілу рашэнняў, іншы раз разважаюць: калі прынята саюзная пастанова, значыць, рэспублікі возьмуцца за яе выкананне. У рэспубліцы таксама той-сёй разважае такім чынам: пленум правялі, рэзалюцыю прынялі – у абласцях усё пойдзе добра, …а ў выніку высвятляецца, што справа "нікуды не пайшла"» [17, с. 14].

У 1981 г. высветлілася, што пасля 1964 г. нікуды справа «не пайшла» і ў напрамку інтэнсіфікацыі ўсіх галін вытворчасці. Таму Л. Брэжнеў, нарэшце, заявіў аб неабходнасці пераводу эканомікі СССР на інтэнсіўны шлях развіцця ў якасці галоўнай задачы XI пяцігодкі. Гэта быў правільны падыход да вырашэння праблемы, але ён, на наш погляд, спазніўся мінімум на 15 гадоў. Як ужо згадвалася, у галіне аграрнай палітыкі было вырашана распрацаваць і прыняць спецыяльную мэтавую праграму развіцця сельскай гаспадаркі краіны. Гэтае рашэнне было ўскосным доказам таго, што папярэдняя сельскагаспадарчая палітыка была пабудавана на недальнабачных, памылковых погля-

дах і стратэгічных праліках, перш за ўсё ў адносінах да вызначэння ролі і месца аграрнага сектара эканомікі ў жыцці грамадства.

Значна пазней, у 1990 г., беларус па паходжанні (нарадзіўся ў в. Старыя Грамыкі Веткаўскага р-на Гомельскай вобл.) член Палітбюро ЦК КПСС (1973–1988 гг.) А. Грамыка, які вельмі добра ведаў Л. Брэжнева, ацэньваючы становішча СССР у 1970 – пачатку 1980-х гг., сказаў: «Эканамічнае становішча краіны было вельмі складаным, а ў некаторых адносінах цяжкім... Мелі месца рознага роду камбінацыі з лічбамі, якія не адлюстроўвалі рэальнага становішча прамысловасці і сельскай гаспадаркі …Сельская гаспадарка Савецкага Саюза перажывала выключна цяжкі перыяд, што яшчэ болей абцяжарвала эканамічнае становішча» [18, с. 48, 49].

**Распрацоўка і прыняцце Харчовай праграмы БССР**

Адносіны савецкага партыйна-дзяржаўнага кіраўніцтва да вырашэння складаных эканамічных пытанняў паўплывалі і на працэс прыняцця Харчовай праграмы. Яе распрацоўка адбывалася звычайным планава-бюракратычным шляхам. На пасяджэнні бюро ЦК КПБ, якое адбылося 22 студзеня 1981 г., было прынята рашэнне, што аблвыканкамы ў тэрмін да 25 сакавіка 1981 г. павінны былі направіць у Дзяржплан БССР праекты харчовых праграм абласцей на ХІ пяцігодку і на перыяд да 1990 г. [19, арк. 25–26]. Затым на пасяджэнні бюро ЦК КПБ 24 красавіка 1981 г. «да ведама» была прынята інфармацыя Дзяржплана БССР аб распрацоўцы праекта Харчовай праграмы рэспублікі, ухваленага Саветам Міністраў БССР [20, арк. 1].

У далейшым заданні Харчовай праграмы ў маі 1982 г. былі ўхвалены пленумам ЦК КПСС. У сваю чаргу, у снежні 1982 г. пленум ЦК КПБ прыняў Харчовую праграму БССР, якая складалася з дзвюх частак [21]. У першай прызнавалася, што ў краіне назіраліся пэўныя цяжкасці ў забеспячэнні насельніцтва харчовай прадукцыяй. У другой былі запланаваны вытворчыя паказчыкі: да канца ХІ пяцігодкі планавалася давесці сярэднегадавую вытворчасць збожжа да 7,8–8,1 млн т, атрымаць у сярэднім за год 1 млн т мяса (у забойнай вазе), малака – 6,5–6,7 млн т, яек – 3,1 млрд штук [21, с. 5–18, 24].

Калі паставіць пытанне: ці адпавядалі харчовыя праграмы СССР і БССР сусветным тэндэнцыям развіцця аграрнай вытворчасці і перспектыўным запатрабаванням савецкага грамадства, то адказ будзе адназначны – не, не адпавядалі. Найперш па той прычыне, што ў пачатку 1980-х гг. асноўнай сусветнай тэндэнцыяй ў галіне аграрнай вытворчасці быў пераход на новую тэхналагічную стадыю развіцця. Да прыкладу, аграрны крызіс, які распачаўся ў ЗША у пачатку 1980-х гг., стымуляваў пошук шляхоў удасканалення сельскагаспадарчага машынабудавання, «асабліва ў кірунку стварэння новых электронных сістэм кантролю і кіравання сельскагаспадарчай тэхнікай» [22, с. 182].

Разам з тым пэўны эфект ад прыняцця Харчовай праграмы ўсё ж быў. Да яе выканання беларускае партыйна-дзяржаўнае кіраўніцтва ставілася адказна, яно ўлічвала неабходнасць паступовага ўкаранення новых тэхналогій. Па кожным з праграмных кірункаў бюро ЦК КПБ прымала асобныя рашэнні яшчэ да мая 1982 г. У верасні 1981 г. бюро ЦК КПБ у мэтах аўтаматызацыі работ у жывёлагадоўлі і кормавытворчасці зацвердзіла праграму ўкаранення аўтаматычных маніпулятараў з праграмным кіраваннем (прамысловых робатаў) у гаспадарку рэспублікі на 1984–1985 гг. Усяго за 5 гадоў было запланавана арганізаваць вытворчасць больш за 1 тыс. аўтаматычных маніпулятаў і прамысловых робатаў розных тыпаў [23, арк. 56–65]. Але не ўсё залежала ад рэспубліканскага кіраўніцтва. Рашэнне, прынятае ў маі 1982 г. па павялічэнні інвестыцый у сельскую гаспадарку, было вельмі складана выканаць. У бюджэце СССР на гэтыя мэты не было грошай. У гэты час у СССР абвастрылася праблема працоўных, фінансавых рэсурсаў, назіраўся дэфіцыт капіталаўкладанняў у выніку зніжэння сусветных цэнаў на нафту і прыродны газ, павялічэння выдаткаў на вайну ў Афганістане, якая абышлася бюд-

жэту СССР у 60 млрд руб. [9, с. 159]. Таму ў 1984 г. было канстатавана, што накіроўваць інвестыцыі ў вёску ў поўным аб'ёме «пакуль не ўяўляецца магчымым» [24, с. 259].

І ўсё ж вынікі выканання заданняў Харчовай праграмы БССР у XI пяцігодцы па многіх пазіцыях былі станоўчымі. Паводле звестак «Аналітычнай запіскі "Аб выкананні Харчовай праграмы Беларускай ССР"», накіраванай Дзяржкамстатам БССР кіраўніцтву Дзяржплана БССР, дырэктывы Харчовай праграмы рэспублікі па вытворчасці збожжа і бульбы не былі выкананы. Разам з тым сярэднегадавую вытворчасць цукровых буракоў (фабрычных) у 1981–1985 гг. было запланавана давесці да 1 383,3 тыс. т (фактычна было атрымана 1 568,4 тыс. т); сярэднегадавую вытворчасць малака ў XI пяцігодцы трэба было давесці да 6 305,8 тыс. т (у 1985 г. было атрымана 6 758,9 тыс. т); сярэднегадавую вытворчасць мяса ў забойнай вазе ў 1981–1985 гг. трэба было давесці да 932,8 тыс. т (у 1985 г. было атрымана 1 031,9 тыс. т) [25, арк. 16, 20, 21].

Станоўчыя зрухі назіраліся і па іншых кірунках. У 1985 г. у БССР было выраблена 70 кг мяса і мясапрадуктаў на душу насельніцтва (пры плане ў 67 кг), 399 кг малака (пры плане 375 кг), 19,7 кг рыбы і рыбапрадуктаў (пры плане 18,0 кг), 57 кг пладоў і ягад (пры плане 43,0 кг), 44,5 кг цукру (пры плане 43,0 кг). Невялікае адставанне назіралася па вытворчасці бульбы і хлебапрадуктаў: у 1985 г. было выраблена 185,0 кг бульбы замест запланаваных 197,0 кг, 131,0 кг хлеба і хлебапрадуктаў замест 140,0 кг, 8,4 кг алею замест 8,5 кг па плане ў разліку на душу насельніцтва [25, арк. 23].

**Заключэнне**

Сакавіцкі 1965 г. мадэрнізацыйны праект, рэалізацыя асноўных палажэнняў гаспадарчай рэформы 1965 г. стымулявалі далейшае развіццё сельскай гаспадаркі Беларусі. У гэты час у мэтах забеспячэння інтарэсаў сялянства дзяржава паспрабавала ўкараніць у вытворчасць эканамічныя формы арганізацыі і аплаты працы ў калгасах і саўгасах. Аднак ва ўмовах росквіту камандна-адміністрацыйнай сістэмы, фармальна-бюракратычнага падыходу да іх укаранення і выкарыстання партыйна-дзяржаўнае кіраўніцтва Беларусі не здолела вырашыць гэтыя задачы.

Важным вынікам развіцця сельскай гаспадаркі Беларусі ў 1965–1975 гг. былі пэўныя поспехі ў раслінаводстве. Упершыню за ўсю гісторыю савецкіх пяцігодак ураджайнасць збожжавых ў калгасах і саўгасах БССР напрыканцы VIII пяцігодкі склала каля 17 ц/га, у канцы IX – 23,3 ц/га. У межах агульнага гаспадарчага комплексу Савецкага Саюза Беларусь выйшла на лідарскія пазіцыі па вытворчасці збожжа, чаго раней ніколі не было. Але дасягненні аграрнай галіны рэспублікі грунтаваліся ў асноўным на ўзмацненні экстэнсіўных метадаў гаспадарання. У 1971–1981 гг. аграрная палітыка не была падмацавана ідэяй прыярытэту сельскагаспадарчай вытворчасці, павышэння яе ролі ва ўмацаванні сацыяльнай стабільнасці і ўнутранай бяспекі дзяржавы. Прыняцце Харчовай праграмы ў 1982 г. нават у перспектыве не дазваляла ліквідаваць тэхналагічнага адставання аграрнай галіны ад краін-лідараў. Дзеля гэтага замест Харчовай праграмы трэба было прыняць праграму прыярытэтнага развіцця сельскагаспадарчай вытворчасці, паскоранага завяршэння яе пераводу на індустрыяльны шлях развіцця. Гэтага не было зроблена. У выніку Савецкая дзяржава і яе кіраўніцтва не здолелі вырашыць сялянска-аграрнага пытання ў кірунку павышэння эфектыўнасці калгасна-саўгаснай вытворчасці і задавальнення спажывецкага попыту на харчовую прадукцыю.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ

1. Коммунистическая партия Советского Союза в резолюциях и решениях съездов. – Изд. 8-е. – М. : Политиздат, 1972. – Т. 8 : 1959–1965. – 567 с.

2. Брежнев, Л. И. Об основных вопросах экономической политики КПСС на современном этапе / Л. И. Брежнев // Речи и доклады : в 2 т. – М., 1975. – Т. 1. – 448 с.

3. Коммунистическая партия Советского Союза в резолюциях и решениях съездов, конференций и пленумов ЦК (1898–1986). – Изд. 9-е. – М. : Политиздат, 1986. – Т. 11 : 1966–1970. – 574 с.

4. Коммунистическая партия Советского Союза в резолюциях и решениях съездов, конференций и пленумов ЦК (1898–1971). – Изд. 8-е. – М. : Политиздат, 1972. – Т. 9 : 1966–1968. – 527 с.

5. Малышев, П. А. Критерий эфективности социалистического воспроизводства / П. А. Малышев, И. Г. Шилин. – М. : Мысль, 1973. – 382 с.

6. Материалы XXIV съезда КПСС. – М. : Политизат, 1974. – 320 с.

7. Матэрыялы XXVII з'езда КПБ. – Мінск : Беларусь, 1971. – 150 с.

8. Брежнев, Л. И. Отчетный доклад ЦК КПСС XXIV съезду КПСС / Л. И. Брежнев // Избр. произведения : в 3 т. – М., 1980. – Т. 2 : 1971–1975. – 568 с.

9. XXVIII съезд КПСС. 2–13 июля 1990 г. : стеногр. отчет : в 7 т. – М., 1991. – Т. 1. – 690 с.

10. Коммунистическая партия Белоруссии в резолюциях : в 7 т. – Т. 6 : 1966–1975.

11. Матэрыялы XXVIII з'езда КПБ. – Мінск : Беларусь, 1976. – 174 с.

12. XXV съезд КПСС. 24 февраля – 5 марта 1976 г. : стеногр. отчет : в 3 т. – М., 1976. – Т. 1. – 472 с.

13. Материалы XXVI съезда КПСС. – М. : Политиздат, 1981. – 223 с.

14. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 4п. Воп. 140. Спр. 123.

15. НАРБ. – Ф. 30. Воп. 9. Спр. 4578.

16. Матэрыялы XXIX з'езда КПБеларусі. – Мінск : Беларусь, 1981. – 127 с.

17. Хрушчоў, М. С. Паспяхова ажыццяўляць рашэнні лютаўскага пленума ЦК КПСС аб інтэнсіфікацыі сельскагаспадарчай вытворчасці : даклад на нарадзе кіруючых работнікаў партыйных, савецкіх і сельскагаспадарчых органаў 28 лютага 1964 г. / М. С. Хрушчоў. – Мінск : Беларусь, 1964. – 88 с.

18. Громыко, А. А. Кое-что о периоде застоя / А. А. Громыко // Коммунист Белоруссии. – 1990. – № 4. – С. 46–51.

19. НАРБ. – Ф. 4-п. Воп. 140. Спр. 43.

20. НАРБ. – Ф. 4-п. Воп. 140. Спр. 68.

21. Продовольственная программа Белорусской ССР на период до 1990 года : утв. постановлением пленума ЦК КПБ 2 дек. 1982 г. – Минск : Беларусь, 1982. – 31 с.

22. Современные США : энцикл. справ. – М. : Политиздат, 1988. – 542 с.

23. НАРБ. – Ф. 4-п. Воп. 140. Спр. 110.

24. Горбачев, М. С. О задачах партийных, советских и хозяйственных органов по повышению экономической эффективности сельского хозяйства / М. С. Горбачев // Избр. речи и статьи. – М., 1987. – Т. 1. – 463 с.

25. НАРБ. – Ф. 30. Воп. 13. Спр. 1619.

Рукапіс паступіў у рэдакцыю 28.10.2016

***Smiakhovich M.V.*** **Soviet Agrarian Policy in Belarus: Directions, Problems, Experience (1965–1985)**

*The main trends and objectives of agrarian policy of the Soviet state in Belarus in 1965–1985 are analyzed. Both positive and negative results in the development of agriculture are defined, the problems that hindered the development of the agricultural segment of the economy are outlined; the results of the party and state leadership of the Soviet Union in the solution of the agrarian question are described. March 1965 modernization project, the implementation of major provisions of economic reform in 1965 stimulated further development of agriculture of Belarus. The BSSR agrarian sector in the economic complex of the Soviet Union occupied the leading position for the production of grain, which has never happened before, in the early 1970s. But agricultural sector achievements were not supported by the idea of its priority to strengthen social stability and internal security of the state in 1971–1981. Union-wide food program of 1982, even in the long run did not allow eliminating the technological gap of agricultural sector from competing countries. As a result the Soviet state and its leaders failed to solve the peasant and agrarian question to meet consumer demand for food products.*